*Областной сминар педагогических идей, июнь 2024*
*«Реализация воспитательного потенциала современного урока»*

Юхновская А.П., учитель белорусского языка и литературы ГУО «Мощаницкая средняя школа Белыничского района»

# Рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу на ўроках беларускай мовы і літаратуры

Адным з асноўных напрамкаў у сферы адукацыі ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Праграмай бесперапыннага выхавання дзяцей і моладзі на 2021-2025 гг. з'яўляецца забеспячэнне дзейнасці ўстаноў адукацыі па выхаванні і фарміраванні ў юнага пакалення духоўна-маральных каштоўнасцей, грамадзянкасці, патрыятызму, пачуццё адказнасці, патрэбы ў здаровым ладзе жыцця.

Беларуская мова і літаратура ў школе не толькі вучэбныя прадметы, але і сродкі выхавання, развіцця. Вельмі важна, каб урокі роднай мовы і літаратуры давалі правільнае разуменне паняццяў патрыятызму, гуманізму, выхоўвалі павагу да нацыянальна-культурных каштоўнасцей свайго народа, садзейнічалі фарміраванню пачуцця нацыянальнай годнасці. Пры распрацоўцы ўрокаў беларускай мовы і літаратуры я аб'ядноўваю прадметную тэму з выхаваўчым напрамкам. Падабраны мною матэрыял арганічна ўваходзіць у структуру ўрока, садзейнічае не толькі паспяховаму засваенню тэарэтычных звестак, фарміраванню арфаграфічных, пунктуацыйных, стылістычных навыкаў і ўменняў вучняў, развіццю іх звязнага маўлення, творчых здольнасцей, але і мае вялікі выхаваўчы патэнцыял.

Магутным вытокам і дзейсным фактарам патрыятычнага і грамадзянскага выхавання ў сучаснай адукацыі з'яўляецца беларуская народная спадчына. Зварот да фальклорнай творчасці, яе даследаванне і захаванне – рэальны фактар выхавання па-сапраўднаму патрыятычнага і духоўна-маральнага пакалення.

Багатым выхаваўчым патэнцыялам валодаюць культуралагічныя тэксты, якія я выкарыстоўваю на ўроку ў якасці дыдактычнага матэрыялу. Праз аналіз зместу я звяртаю ўвагу вучняў на факты духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народа, традыцыі, побыт, каштоўнасці, нацыянальныя сімвалы, спадчыну беларускага народа. Выкарыстоўваю тэксты: "Святы і абрады беларусаў", "Беларускія міфы і легенды". "Адкуль нашы карані", "Беларускія народныя святы", "Звычаі беларусаў", "Скарбы зямлі беларускай".

Таксама прадумана падбіраю тэксты для дыктовак, пераказаў, якія выхоўваюць чалавека-патрыёта. Лічу, што эпіграфы маюць таксама выхаваўчае значэнне. Падбіраю ўрыўкі з вершаў, прасвечаныя тэме роднай мовы, роднай прасторы, зямлі, маці, нацыянальнай адметнасці беларусаў.

Таксама выкарыстоўваю заданні на падбор беларускіх адпаведнікаў да рускамоўных слоў, словазлучэнняў Напрыклад: Как дела? (Як маешся?), Добро пожаловать (Сардэчна запрашаем), Сердечно благодарю (Шчыра дзякую).

На вучэбных занятках выкарыстоўваю рубрыку “Машчаніца – мой родны кут”, “Ганаруся зямлёй беларускай”, “Памяць маёй зямлі”. “Мая маленькая радзіма”.

Паважаныя калегі, прапаную вашай увазе фрагмент урока ў 6 класе па тэме “Падагульненне і сістэматызацыя набытых ведаў па тэме “Назоўнік”, выхаваўчым напрамкам якога з’яўляецца беларуская спадчына. Выхаваўчая задача ўрока:

спрыяць фарміраванню ў вучняў грамадзянскай пазіцыі;

выхоўваць цікавасць і павагу да беларускай народнай культуры, духоўнай спадчыны беларусаў, пачуццё нацыянальнай годнасці і гонару за свой народ.

стварыць умовы для фарміравання ўменняў пераадольваць цяжкасці;

садзейнічаць выхаванню культуры паводзін у час работы ў групах.

Для рэалізацыі данага напрамку выкарыстоўваю розныя віды заданняў.

Картка №1 (Прыказкі.) Заданне першае: з прапанаваных слоў скласці прыказку, растлумачыць яе сэнс. Вусна адказаць на наступныя пытанні:

1. Слоў з мяшок, а спраў на вяршок.
2. Новых сяброў набывай, а старых не забывай.
3. Не рабі ліхога і не бойся нікога.
4. Не май сто рублёў, а май сто сяброў
5. Людзей слухай, а свой розум май.
6. Не зведаўшы броду, не лезь у ваду.
7. Родная зямелька, як зморанаму пасцелька.
8. Дзе гаспадар ходзіць, там хлеб родзіць.
9. Не цані чалавека па твары, а цані па душы.
10. Не той друг, хто мёдам мажа, а той, хто праўду скажа.

Заданне(вусна):

- У прыказках мала слоў, але вялікая мудрасць у іх закладзена, і расказаць яны могуць многае. Якая мудрасць закладзена ў наступных прыказках?

Што надае мове гэты жанр вуснай народнай творчасці?

Заданне(пісьмова):

Выпішыце з прыказак у левы слупок адушаўлёныя назоўнікі, а ў правы – неадушаўлёныя.

Выпішыце з прыказак два назоўнікавыя словазлучэнні і зрабіце іх разбор. Такім чынам, разам з выхаваўчымі задачамі ўрока, адначасова вырашаліся і адукацыйныя задачы.

Картка №2 (Загадкі.). Заданне другое: прачытаць загадкі, разгадаць іх, адказаць на пытанні.

1.Стаіць дуб, а пад дубам дзеці.*(*Бульба.*)*

2.Піліп да палкі прыліп.(Яблык.)

3.Вышэй за ўсіх стаіць, навокал глядзіць, люльку курыць.**(**Комін.**)**

4.Малы малышак упаў з вышак, сам не забіўся, толькі шапачкі пазбыўся.**(**Жолуд**.)**

5.Еду, еду – і ні дарогі, ні следу.**(**Лодка.)

6. Ехаў камісар, на акне ўзор напісаў. **(**Мароз.)

7. Вечарам нараджаецца, ноч жыве, а раніцай памірае. **(**Раса.**)**

8. Не калода і не пень, а ляжыць цэлы дзень, не жне і не косіць, а есці просіць.**(**Гультай.)

9. Без кораня, а расце. (Камень.)

10. Стукае, грукае, нідзе яго не знойдзеш. (Гром.)

Заданне (вусна):

з якой мэтай нашы продкі выкарыстоўвалі ў жыцці жанр вуснай народнай творчасці – загадкі?

што развіваюць і чаму вучаць нас загадкі?

што ўяўляе партрэт беларуса, які ўмее складаць і адгадваць загадкі? Назавіце назоўнікімі якасці гэтага чалавека.

Заданне(пісьмова):

пастаўце назоўнікі-адгадкі ў множным ліку**?** Ці заўсёды мы гэта можам зрабіць? Чаму? Назавіце назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў форме адзіночнага або толькі ў форме множнага ліку.

складзіце словазлучэнні, каб назоўнік *бульба* ўжываўся спачатку ў прамым, а потым у пераносным значэнні.

Картка №3 (Прыкметы і павер'і.). Заданне трэцяе: па пачатку прыкметы аднавіць яе цалкам.

1. Многа снегу…(многа хлеба).

2. Сонца ў хмарку садзіцца…(будзе дождж).

3. Май дажджлівы…(год урадлівы).

4. Зорная купальская ноч…(…на добры ўраджай грыбоў).

5. Вясёлка пасля дажджу…(на добрае надвор'е).

6. Бяроза дае многа соку…(…да мокрага лета).

7. Сухі і цёплы верасень…(на познюю зіму).

8. Зіма снежная…(лета дажджлівае).

9. Увечары трашчаць конікі...(на добрае надвор'е).

10. Шэрань на дрэвах…(…да марозу), туман…(... да цяпла).

Заданне (вусна):

якую ролю ў жыцці нашых продкаў адыгрывалі прыкметы і павер'і?

пра што сведчаць прыкметы і павер'і, невялікая часцінка духоўнага народнага скарбу?

што адбудзецца згодна з кожнай пералічанай прыкметай адпаведна народным назіранням?

Заданне (пісьмова):

пастаўце назоўнікі першага скланення ў форме давальнага склону, назоўнікі другога скланення ў форме роднага склону, назоўнікі трэцяга скланення ў форме творнага склону. Растлумачце правапіс канчаткаў назоўнікаў.

зрабіце марфалагічны разбор падкрэсленага назоўніка са сказа.

Картка №4 (Легенды .) Заданне чацвёртае: пазнаёміцца з легендай пра паходжанне роднай вёскі Машчаніца. Даць адказ на пытанне: чаму вёска Машчаніца атрымала такую назву?

Легенда пра паходжанне назвы вёскі Машчаніца.

Пачатак засялення вёскі Вялікая Машчаніца паклалі выхадцы з вёскі Забалоцце Козыравы і Лапацентавы. А было гэта ў XVI стагоддзі. Пан загадаў ім ахоўваць яго лес і апрацоўваць землі. Козыраў Захар Савельевіч быў палясоўшчыкам на тэрыторыі, дзе зараз знаходзіцца наша вёсачка. Сярод дрымучых лясоў, дзе вадзіліся нават мядзведзі, ён распрацаваў дзялянку, пабудаваў там жыллё. Следам за ім пабудаваў жыллё і Лапацентаў Сцяпан. Хутка іх сем'і параднiліся. Пачала расці вёска. Вось як гэта было. У даліне ракі землі былі ўрадлівыя, але вельмі вільготныя. Вясной і восенню было топка, увесь час стаяла дрыгва: нельга было ні праехаць ні прайсці. Вуліцу вёскі сталі масціць драўлянымі пласцінамі і дошкамі. Таму вёска стала называцца Машчаніца (ад слова “мошчаная”). Асноўным заняткам жыхароў сталі вырошчванне зерневых культур, жывёлагадоўля, рыбалоўства, паляванне, збор ягад і грыбоў. У той жа час жыхары вёскі працавалі на пана Сабаткоўскага, які жыў у Ключыках і арэндаваў гэту зямлю ў пана Месаедава.

Заданне (вусна):

пра што апавядаюць нам легенды, што складаюць неад'емную частку беларускага народнага эпасу? Чаму прымушаюць нас здзіўляцца?

прыгадайце легенду пра паходжанне роднай вёскі Машчаніца.

Заданне (пісьмова):

з якімі словамі трэба спалучаць назоўнікі, каб вызначыць яго род?

выпішыце з тэксту “Легенда пра паходжанне назвы вёскі Машчаніца” пяць назоўнікаў жаночага роду, пяць назоўнікаў мужчынскага і пяць назоўнікаў ніякага роду.

выпішыце з тэксту легенды ўласныя назоўнікі.

Картка №5 (Казкі.) Заданне пятае: па зачыне пазнайце казкі. Якія якасці людзей знаходзяць увасабленне ў прапанаваных урыўках? Назавіце іх назоўнікамі. Чаму казкі лічаць найцікавейшай старонкай фальклорнай спадчыны?

“Жыў дзед з бабай. Былі яны вельмі бедныя: ні насіць няма чаго, ні варыць. Вось баба і кажа дзеду: – Вазьмі, дзеду, тапарок, паедзь у лясок, ссячы дубок, завязі на рынак, прадай і купі гарчык мукі. Спячом хлеб.” (“Каток- залаты лабок”).

“Жыў адзін бедны мужык. Зіму так-сяк перакідаўся, а прыйшла вясна – хоць зубы на паліцу лажы. Адна гуска засталася, ды і тая худая…” (“Як мужык гусей дзяліў”).

“Былі ў аднаго чалавека тры сыны: два разумныя, а трэці – дурны. Старэйшы сын, Сцяпан, умеў на скрыпцы іграць, сярэдні Піліп, – на дудцы, а меншы, Іван, ні да чога спрыту не меў: сядзеў у запечку ды лучынкі стругаў…” (“Залаты птах”).

“Худы воўк хадзіў каля вёскі і сустрэў тлустага сабаку. Воўк пытаецца ў сабакі: – Скажы, сабака, дзе вы корм бераце? Сабака яму гаворыць:– Людзі нам даюць…” (“Воўк і сабака”). “Жылі-былі асёл, сабака, кот і певень. Калі яны пастарэлі, гаспадары павыганялі іх з двароў. Неяк раз у ночы сышліся ў лесе гэтыя бяздомныя. Пазнаёміліся, пачалі думаць, як на свеце жыць, чым займацца…” (“Музыкі”).

“Жыў адзін чалавек з жонкаю. Нарадзілася ў іх дачка. Прыйшлося спраўляць радзіны. А ў чалавека таго ні хлеба, ні да хлеба. Чым гасцей частаваць?” (“Разумная дачка”).

Заданне (вусна):

якія жыццёвыя ўрокі даюць нам казкі, адзін з галоўных жанраў фальклору, самая найцікавейшая старонка фальклорнай спадчыны?

па зачыне пазнайце казкі. Якія якасці людзей знаходзяць увасабленне ў прапанаваных урыўках? Назавіце іх назоўнікамі.

Заданне (пісьмова):

вызначыць сінтаксічную ролю назоўнікаў у выдзеленым сказе.

якімі спосабамі могуць утварацца назоўнікі? Выпішыце пяць назоўнікаў, утвораных суфіксальным спосабам, з адпаведнага ўрыўку казкі.

Такім чынам, выхаваўчы патэнцыял на ўроку мае вельмі важнае зачэнне для развіцця і выхавання вучняў. Выкарыстанне нацыянальна-афарбаванага моўнага матэрыялу павышае інтэлектуальны

ўзровень вучняў, развівае іх камунікатыўнасць, далучае да багатай спадчыны беларускага народа. Вучні не толькі атрымліваюць культуразнаўчую інфармацыю этнагафічнага і лінгвакультуралагічнага характару, але і набываюць уменні карыстацца ёю з мэтай забеспячэння паўнацэннай камунікацыі, фарміруюць уласнае культурнае аблічча, нацыянальную самастойнасць. Лепшыя традыцыі народнай спадчыны развіваюць светапогляд вучняў, садзейнічаюць выхаванню ў нашчадкаў патрыятызму.